# ЖАНРАВА-СТЫЛЁВАЯ АДМЕТНАСЦЬ АПАВЯДАННЯЎ М. СТРАЛЬЦОВА І В. АДАМЧЫКА КАНЦА 1950-Х ГАДОЎ

Дамброўская Н.М.
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт

Многія творы В. Адамчыка і М. Стральцова распавядаюць пра асабіста перажытае, іх эмацыйны, экспрэсіўны аповед абумоўлівае характэрныя асаблівасці тэкстаў, уплывае на кампазіцыю, стылістыку, пафасную танальнасць, вызначае адбор вобразна-выяўленчых мастацкіх сродкаў, частотнасць іх выкарыстання.

Стыль пісьма прадстаўнікоў філалагічнага пакалення даследчыкі слоўнага мастацтва вызначалі лаканічна і трапна яшчэ ў 1960–1970-я гады: гэта стыль паэзіі ў прозе, паэзіі як стану душы, як выніку ўнутранай настроенасці. Пейзажныя замалёўкі, рытміка асобных фраз і тэксту ў цэлым, колеранайменні ў творах гэтых пісьменнікаў адпавядаюць лірычнаму, экспрэсіўна-суб'ектывізаванаму светаадчуванню аўтараў. Адсюль такія выдатныя, «гаваркія» вобразы, як «блакітны вецер», «сена на асфальце», «жураўліная песня», «добрае неба» (М. Стральцоў), «жывая вада», «млечны шлях», «срэбра на павуціне», «дзікі голуб» (В. Адамчык), пачуццевасць, глыбокі, прасякнуты шчырым перажываннем роздум.

Лірычны настрой першага зборніка апавяданняў М. Стральцова «Блакітны вецер» (1962) загучаў больш выразна ў другім зборніку – «Сена на асфальце» (1966). Мяккі, паэтычны лірызм як адну з галоўных уласцівасцей стылю гэтага пісьменніка адзначалі Р. Барадулін, С. Кавалёў, У. Мехаў, В. Палтаран, А. Станюта, А. Сямёнава і інш. У творах М. Стральцова і В. Адамчыка вельмі часта з'яўляюцца «настраёвыя пейзажы», што спрыяе лірызацыі прадметных рэалій матэрыяльнага свету. Так, звычайная паездка дадому можа ператварыцца ў свята душы («Пах летняй травы» В. Адамчыка, «Дома», «Там, дзе зацішак, спакой»

М. Стральцова) ці выклікаць смутак, трывожна-роздумны настрой («Дзікі голуб», «Сцежка на расходніку» В. Адамчыка) або напоўніцца трагізмам, драматызмам («Маладзіковая нядзелька» В. Адамчыка).

Лірызм, эмацыянальнасць уплываюць і на адметнасць сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твораў М. Стральцова і В. Адамчыка. Многім апавяданням гэтых пісьменнікаў уласціва такая асаблівасць сюжэтабудовы, як аднаэпізоднасць. У аснову твораў пакладзены надзвычай запамінальны, незвычайны выпадак, які аказвае рашаючы ўплыў на далейшае жыццё героя, бо некалі асабліва ўразіў яго. Дзякуючы выключнасці, рэзкай акрэсленасці ў свядомасці, такія эпізоды, факты набываюць адзнакі «ўшчыльненага» псіхалагізму, мяняюць лёс герояў, адкрываюць перад імі рэальную сутнасць жыцця, яго шматграннасць, дапамагаюць глыбей убачыць і адчуць яго сэнс. Гэта ў сваю чаргу вызначае такія асаблівасці твораў В. Адамчыка і М. Стральцова, як вольнае спалучэнне рацыянальнага і ірацыянальнага пачаткаў, некалькіх часавых вымярэнняў. Парушаецца храналагічная паслядоўнасць падзей, з'яўляецца фрагментарнасць, ствараецца рытм, набліжаны да паэтычнага. Калі проза набывае адзнакі паэзіі, то пачынае актывізавацца значэнне паэтычнага сінтаксісу: узрастае роля паўзаў, паўтораў, зваротаў, воклічаў і іншых рытарычных фігур.

Экспрэсіўнасць апавяданняў В. Адамчыка «Жывая вада», «Пах летняй травы», «Аптэка нумар тры», «Дзікі голуб» і некаторых іншых твораў таксама дасягаецца пры дапамозе маналагічнай формы аповеду, яркай вобразнасці, трапеізацыі мовы, яе рытмізацыі. Аднак М. Стральцоў больш свабодны, чым В. Адамчык, у выбары жанравых формаў. У апавяданні і аповесці пісьменнік уводзіць ускладненыя экспрэсіўныя раздзелы-ўстаўкі, напісаныя верлібрам, эпісталярныя часткі ў форме лістоў лірычных герояў, аповеды ад імя «чужой» асобы, лірызаваныя маналогі і дыялогі (трыпціх («Трывожна крычыць птушка», «Жураўліная песня», «Падарожжа за

горад»), «Сена на асфальце», «Смаленне вепрука», «Адзін лапаць, адзін чунь», «Роздум»).

Павышанай экспрэсіўнасці, лірызацыі твораў В. Адамчыка і М. Стральцова ў 1950–1960-я гады ў многім спрыяла і рамантычная настроенасць аўтараў. Рамантызацыя твораў прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення» была абумоўлена ў многім дэмакратычнымі зменамі, што адбываліся ў грамадстве ў перыяд хрушчоўскай «адлігі». Пісьменнікі дакладна ўзнаўлялі тагачасную атмасферу жыцця, поўную аптымізму, ілюзій і спадзяванняў. Апавяданням М. Стральцова («Свет Іванавіч, былы донжуан», «Роздум») і В. Адамчыка («Белы снег», «Зоня») гэтага перыяду ўласцівы ўзнёсласць, прыўзнятасць у стварэнні характараў герояў.

Галоўным героем у сувязі з гэтым у апавяданнях М. Стральцова і В. Адамчыка з'яўляецца малады чалавек-летуценнік, натура шырокай душы, эмацыянальна ўражлівы, шчыры, па-дзіцячы непасрэдны і даверлівы, які не прымае пасіўнасць, імкнецца разважаць і дзейнічаць самастойна, патрабавальна адносіцца да самога сябе і да іншых. Героям-рамантыкам уласціва пазіцыя актыўнага дзеяння, непрымірымасць да ідэйных і маральных кампрамісаў, пачуццё асабістай адказнасці перад грамадствам.

Унутранай гармоніі шукае Лагацкі з апавядання М. Стральцова «Блакітны вецер» (1960). Пасля доўгіх пакутлівых разваг і думак, пошуку душэўнай раўнавагі і ладу, падрабязна паказаных аўтарам, герой твора прыходзіць да высновы, што «трэба смялей і весялей жыць: пазбавіцца раўнадушша, чэрствасці, замкнутасці ў сабе. І тады ніколі не пакіне мяне блакітны вецер» [1, с. 55]. Мастак-паэт «аздабляе» свой твор выдатным рамантычным вобразам блакітнага ветру, які дапамагае выразней раскрыць душэўны стан персанажа.

Героям апавяданняў В. Адамчыка 1950–1960-х гадоў («Зоня», «Млечны шлях», «Ліповы цвет», «Міг бліскавіцы», «Белы снег» і інш.) таксама ўласцівыя высакародныя душэўныя памкненні, жаданне духоўна

ўзбагаціцца, сфарміраваць свой характар і сябе як сумленную асобу, выпрацаваць самастойную, сталую жыццёвую пазіцыю. Так, пафас апавядання «Млечны шлях» (1960) абумоўлены складанымі пошукамі маладым пакаленнем свайго месца ў жыцці. У цэнтры твора – душэўныя перажыванні галоўнага героя Косці Манцэвіча – юнака з устойлівымі жыццёвымі прынцыпамі, які не прымае фальш, прыстасаванства, хлусню, цвёрда верыць у правільнасць выбранага ім шляху ў жыцці, з’яўляецца максімалістам па пачуццях, па імкненні зведаць і адстаяць высокае прызначэнне чалавека на зямлі, не запляміць яго імя пад «млечным шляхам». Праз сваё праўдалюбства студэнт-выдатнік філалагічнага факультэта выключаны з інстытута пасля выступлення на камсамольскім сходзе з крытыкай бяздарнага выкладчыка Зарэкі. Па сутнасці, у аснову «Млечнага шляху» пакладзены канфлікт шчырасці і хлусні, выкліканы непрымірымасцю маральных прынцыпаў Косці Манцэвіча, які дзеля сцвярджэння справядлівасці і не ішоў на згоду з уласным сумленнем і поглядамі пазбаўленых цвёрдых жыццёвых прынцыпаў людзей (Зарэка, яго «выхаванец» Пецька Жвір). Драматычныя абставіны, з якімі сутыкнуўся юнак, толькі выпрабоўваюць яго на трываласць. Герой апавядання вытрымлівае іх з годнасцю. Праз два гады ён вернецца са станоўчай характарыстыкай з месца працы і адновіцца ў інстытуце, а Зарэку звольняць з працы за неадпаведнасць пасадзе, пра што нават надрукуюць у газеце артыкул.

Такім чынам, жанрава-стылёвай разнастайнасцю, пафасам, зместам творчасць В. Адамчыка блізкая да творчасці М. Стральцова. Выбар у якасці галоўнага героя юнака-рамантыка, вызначальных вобразаў-сімвалаў, прыёмы пісьма, выкліканыя яго рамантызацыяй, лірызацыяй, ствараюць адметны – з яркімі малюнкамі, кантрастны, рухомы – мастацкі свет твораў В. Адамчыка і М. Стральцова канца 1950-х гадоў.

**Літаратура**

1. Стральцоў, М.Л. Ад маладзіка да поўні: апавяданні, аповесці, эсэ / Міхась Стральцоў; уклад. В. Стральцовай. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 430 с.